Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28

DOI:10.17951/sb.2015.9.315
Studia Białorutenistyczne 9/2015 Językoznawstwo

Анастасія Марозава

Narodowa Akademia Nauk Białorusi (Mińsk, Białoruś)
National Academy of Sciences of Belarus (Minsk, Belarus)

E-mail: morozova-nastasya@mail.ru

# Запазычанні з польскай мовы як лексічны кампанент варыянтнай пары

*Zapożyczenia polskie jako komponenty ciągu wariantów leksykalnych*

*Loan-words from polish language as a component of variant pair*

З канца 80-х гг. XX ст. у беларускамоўнай публіцыстыцы павялічылася колькасць польскамоўных лексічных сродкаў, якія з дастатковай частатой і рэгулярнасцю выкарыстоўваліся ў першую чаргу на старонках перыядычнага друку. У стылістычных адносінах ужыванне слоў польскамоўнага паходжання, асабліва на пачатковым этапе, надавала тэкстам пэўную экспрэсію і стварала ўражанне навізны. Пазней было акрэслена іх кола і праведзена інвентарызацыя, якая паказала, што навізна некаторых з лексем – толькі адносная. Адносны характар навізны мелі тыя са слоў, што ўжо былі вядомыя беларускай мове, аднак па экстралінгвістычных прычынах выйшлі з актыўнага ужытку, і цяпер уяўляюць сабою адраджэнне ранейшых моўных здабыткаў. Вяртанне ва ўжытак адбылося на хвалі тых працэсаў, што працякаюць у мове. Адбываецца „перагляд арыенціраў у моўным развіцці”[1], які закранае і працэсы запазычвання. Асаблівасць такіх запазычанняў у тым, што яны не служаць для абазначэння новых рэалій і паняццяў, а ўступаюць у адносіны лексічнай варыянтнасці з кадыфікаванымі беларускамоўнымі адзінкамі, што ўжо функцыянуюць у мове з тоеснымі значэннямі. Найчасцей падобнае адбываецца ў адносінах да слоў, агульных для лексічнага фонду беларускай і рускай моў, і выклікана жаданнем нацыянальна арыентаваных носьбітаў скасаваць або ў значнай ступені аслабіць уплыў з боку рускай

[1] L. M. Szakun, *„Усходнія” і „zachodnija” krynicy papauniennia leksicznych srodkau biełaruskaj mowy*, „Wiesn. Bieł. dziarż. un-ta”. Sier. 4. Fiłałohija. Żurnalistyka. Piedagogika. Psichałohija, Minsk 1995, 2, s. 26.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



мовы. Паколькі сёння ў краіне руская мова з'яўляецца другой дзяржаўнай, то яе непасрэдны ўплыў на беларускую большы, чым з боку польскай мовы. Таму пры магчымасці выбару носьбіты аддаюць перавагу варыянту, які не супадае з расійскім – бліжэйшаму да польскага.

Падобныя словы, як правіла, абазначаюць камунікацыйна важныя паняцці, таму адразу трапляюць у сферу сацыяльнай увагі. Польскамоўныя і запазычаныя праз пасрэдніцтва польскай мовы лексемы, якія ўступілі ў адносіны варыянтнасці з беларускамоўнымі адпаведнікамі, адносяцца да некалькіх тэматычных груп:

1) **лексічныя адзінкі канфесійнай тэматыкі** (*кляштар – манастыр, капліца – часоўня, цвінтар – пагост* і інш.);

2) **назоўнікі, якія абазначаюць асобу** (*амбасадар – пасол, страйковец – забастоўшчык, кіроўца – вадзіцель і інш.);*

3) **назоўнікі з прадметным значэннем** (*асобнік/паасобнік – экзэмпляр* кнігі), *фатэль – крэсла, вязьніца – турма, лецішча – дача, строй – касцюм* (нацыянальны), *напой – напітак, імбрык – чайнік (для заваркі), слухаўка – трубка (тэлефонная), ровар – веласіпед, валіза – чамадан, ліст – пісьмо, мапа – карта (геаграфічная), гарбата – чай, кавярня – кафэ, улётка – лістоўка, кайданкі – наручнікі*, *ходнік – тратуар, коўзанка – каток, пастарунак – пост, налепка – наклейка, лядоўня – халадзільнік і інш*.);

4) **назоўнікі з агульным значэннем** (*чыннік – фактар, стасункі – адносіны, выстава – выстаўка, звяз – саюз*, *страйк – забастоўка і інш.).*

Сярод названых лексічных сродкаў выдзяляюцца два тыпы адзінак паводле ўмоў, на аснове якіх яны ўключыліся ў адносіны варыянтнасці. Да першага тыпу належаць польскамоўныя сродкі, якія з'яўляюцца непасрэдна запазычаннямі апошняга часу (слухаўка, страйк), да другога – словы, якія з'яўляюцца паўторнымі запазычаннямі ў беларускую мову.

У абодвух выпадках бывае цяжка размежаваць спрадвечнабеларускія і запазычаныя словы. У першым выпадку цяжкасць заключаецца ў тым, што граматычны лад, слоўнікавы склад і тыпы словаўтварэння даволі блізкія ў беларускай і польскай мовах. Роднасць моў спрыяе надзвычай лёгкаму ўспрыманню і ўключэнню ў слоўнікавы склад беларускай мовы паланізмаў. Аднак яна ж і ўскладняе вызначэнне польскага запазычання ў слоўнікавым складзе беларускай мовы: марфалагічная і фанетычная форма, значэнне адпавядаюць заканамернасцям беларускай мовы і яе словаўтваральнай сістэмы. Таму словы могуць у аднолькавай ступені з'яўляцца як запазычаннямі з польскай мовы, так і быць утворанымі на беларускім матэрыяле[2].

У другім выпадку цяжкасць выклікана тым, што значная колькасць паланізмаў у беларускай мове не проста засвойваецца, а па сутнасці асімілюецца. Запа-

[2] W. I. Ułasiewicz, N. M. Dauhulewicz, *Leksicznyja pracesy u biełaruskaj mowie kanca XX – paczatku XXI stst.*, [w] *Nacionalni mowy i kultury w jich specyfici ta wzajemodiji*, „Mowa i kultura" (Naukowyj żurnał 2007), wyp. 9, t. 6 (94), Kyjiw, s. 25.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



зычаныя лексемы настолькі арганічна ўпісваюцца ў беларускамоўны кантэкст, што часта носьбіт і не здагадваецца пра іх іншамоўнае паходжанне. Словы другога тыпу з'яўляюцца даўнімі запазычаннямі з польскай мовы і таму сёння ўжо не ўспрымаюцца як іншамоўныя элементы. Для іх мовазнаўцы прапануюць тэрмін паўторнае запазычанне. Пад уплывам польскай мовы актывізуецца выкарыстанне раней нізкачастотных лексем, якія цяпер выступаюць лексічнымі варыянтамі да кадыфікаваных слоўнікамі слоў. Паўторнымі запазычаннямі з'яўляюцца:

а) адзінкі, якія маюць статус адроджаных да ўжытку слоў (на папярэдніх этапах развіцця беларускай мовы адносіліся да актыўнай лексікі, але страцілі актуальнасць);

б) адзінкі, што належаць да дыялектных рэсурсаў беларускай мовы (уваходзяць у пасіўны фонд беларускай мовы, але паступова перамяшчаюцца з перыферыі ў цэнтр).

Калі тая ці іншая новая лексема рэгулярна на працягу пэўнага часу выкарыстоўваецца ў публіцыстычным дыскурсе і вусным маўленні, гэта сведчыць пра факт яе існавання як актыўнага лексічнага сродку ў беларускай мове. У большасці аўтараў не назіраецца імкненне дыферэнцыяваць варыянты ў залежнасці ад семантыкі. Такія словы ўспрымаюцца як абсалютныя сінонімы. Аднак больш правільна казаць пра іх функцыянаванне ў якасці лексічных варыянтаў, паколькі, як зазначае А. Фёдараў, размова ідзе „пра так званую нейтралізацыю слоў-сінонімаў, г.зн. пра сціранне семантычных адрозненняў паміж імі, пра магчымасць амаль поўнай іх узаемазамяняльнасці”[3]. Пры гэтым яны могуць выступаць як сінонімы, калі ўжываюцца аўтарам у адным тэксце ці нават побач у адным сказе, каб пазбегнуць паўтору.

Разгледзім выпадкі функцыянавання ў сучаснай беларускай мове запазычанняў абодвух тыпаў, што з'яўляюцца лексічнымі кампанентамі варыянтных пар.

З 90-х гг. XX ст. пачаў выкарыстоўвацца неалагізм *слухаўка,* які з'яўляецца лексічным варыянтам слова *трубка* (тэлефонная трубка): *„Часам званіў тэлефон, і дачка сама брала **слухаўку**”*[4]; *„Тая наўмысна не здымала **трубку**: вызначальнік паказваў нумар бацькі, лёсам якога яна так і не пацікавілася…”*[5]. Матывацыяй для ўзнікнення гэтага неалагізма паслужыла функцыянальнае прызначэнне прылады (трубка для слухання). П. Сцяцко выказвае думку, што такім спосабам мова імкнецца да дыферэнцыяцыі найменняў пры абазначэнні розных рэалій[6]. Паколькі слова *трубка* мнагазначнае, неалагізм *слухаўка* можа служыць для адрознення значэнняў: *трубка палатна* – сувой, скрутак або рулон, *трубка для слухання – слухаўка*.

3 A. W. Fiodorow, *Osnowy obszczej tieorii pieriewoda*, Moskwa: Izd-wo IJaz. RAN, 1996, s. 9.
4 A. Żdan, *Czas idzie*, „Połymia” 1998, 7, s. 25.
5 J. Jawicz, *Adzinaja daczka*, „Litaratura i mastactwa” 2011, 4, s. 9.
6 P. Sciacko, *Kultura mowy*, Minsk 2002, s. 106.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



У лінгвістычнай літаратуры ўказваюцца найбольш верагодныя шляхі з'яўлення неалагізма *слухаўка* ў беларускай мове:

1) утвораны ад асновы дзеяслова *слухаць* пры дапамозе суфікса *-аўк-(-оўк-)*. Вытворныя з гэтым суфіксам ва ўсходнеславянскіх мовах абазначаюць пераважна прадметы: параўн. бел. *пырскаўка*, укр. *слухавка* (тэлефонная трубка) і *руханка* (замест *гімнастыка*, *фіззарадка*). Як засведчана ў *Беларускай граматыцы*, словаўтваральны тып з гэтым суфіксам набывае прадуктыўнасць у гутарковай мове[7];

2) утвораны шляхам кандэнсацыі („сціскання") ад словазлучэння *слухавая трубка*: *слуха-в(ая) + (труб)ка → слухаўка[8];*

3) запазычаны з польскай мовы[9]. Намінацыі з коранем *слух-* для абазначэння прылады для слухання (тэлефоннай трубкі) уласцівыя і іншым славянскім мовам: славацкае *sluchadlo* – тэлефонная трубка, чэшскае *sluchatko* – тэлефонная трубка, польскае *słuchawka* – тэлефонная трубка і *słuchawki* – навушнікі, украінскае *слухавка* – тэлефонная трубка. У некаторых гаворках Заходняй Беларусі сустракаецца форма множнага ліку *слухаўкі* са значэннем 'навушнікі': *„Некалі радзіва такого ні было, як ціпер, тулькі* ***слухаўкі*** *слухалі"[10] ; „Надзеў* ***слухаўкі****, сеў, як стары, і слухая радзіво – а там песьні"*[11].

Паміж літаратурнай нормай і рэальным маўленчым узусам заўсёды існуюць большыя ці меншыя разыходжанні: у слоўніках у якасці нарматыўных зафіксавана адно слова, а маўленчая практыка сведчыць пра шырокае выкарыстанне варыянтаў. На сучасным этапе існавання беларускай мовы так адбываецца са словамі *карта* і *мапа*, *веласіпед* і *ровар*.

У нацыянальным друку для перадачы значэння 'зменшаны чарцёж зямной паверхні або яе часткі з пераважным улікам тых або іншых спецыяльных прымет'[12] ужываюцца варыянты *карта* і *мапа*: *Старая* ***мапа*** *Гродзенскай губерні таксама ўтрымлівае ў гэтым месцы шуканую назву ўрочышча Красносток* (Ігар Жук. Сустрэчны рух: Літаратуразнаўчыя эцюды); *Зірнуўшы на* ***карту*** *Беларусі, можна пераканацца ў тым, што кожны наш рэгіён мае свой буйны фестываль* (Культура, 2009, 4).

---

[7] *Biełaruskaja hramatyka* [u 2 cz.], cz. 1, *Fanałohija. Arfaepija. Marfałohija. Słowautwarennie, Nacisk*, red. W. Biryła, Pawieł. Pawławicz Szuba, Minsk: Nawuka i technika, 1985, s. 242.

[8] P. Sciacko, *op. cit*., s. 107.

[9] W. I. Ułasiewicz, *Słounik nowych słou biełaruskaj mowy*, Minsk 2009, s. 332.

[10] A. P. Cychun, *Skarby narodnaj mowy (z leksicznaj spadczyny nasielnikau Hrodzienskaha rajonu)*, Hrodna 1993, s. 132.

[11] I. P. Czyhryn, *Jaszcze adzin wyraj z naszych słou wioski Czamiary Słonimskaha rajona,* [u:] *Żywoje nasza słowa*. red. L. P. Kuncewicz, I. J. Jaszkin, Minsk, Dyjalektał. zb., NAN Biełarusi, Instytut mowaznaustwa im. Jakuba Kołasa, 2001, s. 187.

[12] *Tłumaczalny słounik biełaruskaj mowy*: u 5 t., t. 2, red. K. K. Atrachowicz (K. Krapiwa), Minsk 1978, s. 647.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



Словы *карта* і *мапа* прыйшлі ў беларускую мову з польскай, але маюць розныя крыніцы паходжання. Слова *мапа* ўласціва заходнеславянскім мовам: польскае, славацкае і чэшскае *mapa*; слова *карта* запазычана праз польскае karta, італьянскае carta з лацінскага charta, ад грэчаскага chartes[13]. У сучаснай беларускай мове слова *карта* мае значэнне не толькі чарцяжа зямной паверхні або зорнага неба (карта геаграфічная), але і карты санаторнай, карты для гульні. Мнагазначнасць слова развілася яшчэ ў старабеларускі перыяд: карта 1) афіцыйны або прыватны пісьмовы дакумент; распіска, вэксаль; 2) пранумераваны аркуш, старонка; 3) адзін з цвёрдых папяровых лістоў, якія складаюць набор (калоду) для гульні[14]. Слова *мапа* было запазычана толькі са значэннем ‘геаграфічная карта’, у той час як у слове *карта* яно адно з некалькіх. Магчыма, на гэтай падставе ў творах на гістарычную тэматыку аўтары аддаюць перавагу варыянту *мапа*: *Усе маўчалі, гледзячы на* ***мапу****. Прыдняпроўе, зрэзанае сінімі стужкамі рэк, зялёнымі плямамі лясоў, цёмнымі кропкамі вёсак і гарадоў ляжала перад імі*[15]*; Гедзімін і Альгерд амаль не выходзілі з пакояў, дзе мясцілася княская казна, а таксама куфры з* ***мапамі****, на якіх намаляваныя былі планы іншых еўрапейскіх сталіц*[16]*; З ранку да абеду і на цэлыя вечары зачыняліся ў асобным пакоі княжага палаца і гадзінамі стаялі над* ***мапай*** *ці сядзелі ля печы і разважалі пра ўсе неабходныя дзеянні, спрачаліся, прымалі рашэнні*[17].

*Такое суіснаванне і адначасовае размежаванне слоў мапа* і *карта* засведчана ў слоўніках 20-х гг.: *карта* – карта, пісьмо[18] і *мапа* – *карта* (географическая)[19]; *карта* – нарыс часьці зямлі, мора, неба; карта[20]; *карта* – письмо, записка; карта[21]. У дыялектных слоўніках таксама размяжоўваюцца словы *карта* і *мапа* (*карта* – павестка, ліст, старонка і *мапа* – уст. карта): *Раней казалі* ***карта****, як кого вызывалі, каб у суд яўляўса*[22]*; Далі* ***карту*** *ў вармію ісці*[23]*; Узялі гэты пашпарт, паслалі аш у Плешчыніцы, там ужо праверылі, аказалася, усе* ***карты*** *ё, павыдзіраных*

13 S. M. Strukawa, *Słounik archaizmau i histaryzmau (pa tworach biełaruskaj mastackaj litaratury i publicystycy)*, Minsk 2007, s. 49.

14 M. R. Pryhodzicz, H. K. Ciwanowa, *Starabiełaruski leksikon. Padruczny pierakładny слоўнік*, Мінск 1997, s. 92.

15 U. Karatkiewicz, *Kałasy pad siarpom twaim*: Raman, kn. pierszaja, druhaja. Dla siared. i st. szk. uzrostu, Junactwa, Minsk 1981, s. 372.

16 W. Ipatawa, *Alhierdawa dzida. Wiaszczun Hiedzimina*, Minsk 2002, s. 356.

17 K. Tarasau, *Try życci kniahini Rahniedy,* Minsk 1997, s. 223.

18 M. Bajkou, Ś. Niekraszewicz, *Biełaruska-rasiejski słounik*, Miensk 1926, s. 142.

19 *Ibid.*, s. 166.

20 W. Łastouski, *Padruczny rasiejska-kryuski (biełaruski) słounik. Wydannie faksimilnaha typu*, Kouna 1924, s. 251.

21 W. Łastouski, *op. cit.*, s. 120.

22 *Turauski słounik*, u 5 t., t. 3. [Skład. A. A. Krywicki, H. A. Cychun, I. J. Jaszkin], Minsk: Nawuka i technika, 1984, s. 16.

23 *Słounik biełaruskich haworak paunoczna-zachodniaj Biełarusi i jaje pahraniczcza*: u 5 т., t. 2, red. J. F. Mackiewicz, Minsk: Nawuka i technika, 1980, s. 423.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



***картаў*** *німа*[24]*; На сцене вісела* ***мапа***[25]***;*** *Калі ведаць добра* ***мапу****, то зусім лёхка будзе геаграфію здаваць*[26]. *Апошні прыклад ілюструе, што слова мапа* захавалася ў вусным дыялектным маўленні, але пасля 20-х гг. яго не фіксаваў ні адзін акадэмічны слоўнік. З пачатку XXI ст. слова *мапа* рэгулярна сустракаецца на старонках беларускамоўных перыядычных выданняў у артыкулах на гістарычную або турыстычную тэматыку: *Асартымент „Амазону" не абмяжоўваецца кнігамі. На* ***мапы*** *таксама ёсць попыт – падрабязную каляровую схему беларускіх аўтамабільных дарог з плянам Менску можна набыць за 11 даляраў* („Наша Ніва", 29 IV 2005); *Спадкаемцамі яшчэ адной, ужо не існуючай* ***на мапе*** *краіны – Чэхаславаччыны – стануць чэхі, шматразовыя пераможцы ўсясьветных першынстваў і Алімпійскіх гульняў* („Свабода", 29 IV 2008); *Ад Плошчы Каталоніі злева ўверх пойдзе Рамбла дэ Каталонія, з якой, арыентуючыся* ***па мапе****, вы праз пару кварталаў павернеце направа, на Прэч дэ Грацыя, каб пабачыць некаторыя дамы Гаўдзі* („Звязда", 21 IX 2010).

Альтэрнатыўныя адзінкі *веласіпед* і *ровар* служаць для называння 'двух- або трохколавай машыны для язды, якая прыводзіцца ў рух нагамі'. *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы*[27] *фіксуе абедзве лексемы, але слова ровар* мае стылістычную памету (*абл.*), якая ўказвае на тэрытарыяльную абмежаванасць яго выкарыстання. Паколькі ў слоўніку ў асноўным адлюстравана лексіка беларускай мовы 50-х–70-х гг., „рэестр у многім не адпавядае сучаснаму стану лексіка-фразеалагічнага складу беларускай мовы, не адпавядае сучаснаму стану лексіка-фразеалагічнага складу беларускай мовы, не адпавядае сучаснаму стану лексіка-фразеалагічнага складу беларускай мовы, не адлюстроўвае словаўжыванне сучаснага узусу"[28].

Спецыфіку рэгіянальнага ўжывання лексем *веласіпед* і *ровар* вызначае не столькі дыялектны падзел беларускай мовы, колькі ў значнай ступені сацыяльна-культурныя фактары. Адметнасць існавання гэтых варыянтаў у беларускай мове заключаецца ў тым, што абодва словы служаць для называння прадмета матэрыяльнай культуры і былі запазычаны ў мову разам з самім прадметам. Паколькі ні адзін з варыянтаў не з'яўляецца ўласнабеларускім па паходжанні, то спецыфіка ўжывання кожнага з іх абумоўлена крыніцай і часам запазычання.

[24] *Słounik haworak centralnych rajonau Biełarusi*: u 2 t., t. 1, red. J. S. Miacielskaja, Minsk: Uniwiersiteckaje, 1990, s. 186.
[25] I. K. Bialkiewicz, *Krajowy słounik uschodniaj Mahilouszczyny*, Minsk: Nawuka i technika, 1970, s. 131.
[26] *Słounik haworak centralnych rajonau Biełarusi*, *op. cit*., s. 225.
[27] *Tłumaczalny słounik biełaruskaj mowy*, *op. cit*., t. 4, s. 710.
[28] W. P. Lemciuhowa, *Biełaruskaja akademicznaja leksikahrafija: stan, prablemy,* [u:] *Suczasnyja prablemy biełaruskaj leksikałohii i leksikahrafii*. Materyjały miżnarodnaj nawukowaj kanfierencyi, 19–20 listapada 2005 h., NAN Biełarusi, In-t mowaznaustwa imia Jakuba Kołasa, Minsk: Prawa i ekanomika, 2006, s. 189.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



Слова *веласіпед* запазычана праз рускую мову з французскай (фр. *vélocipède*, ад лац. *velox*, *-ocis* = *хуткі* + *pes*, *pedis* = *нага*)[29]. Дакладны час уваходжання слова ў беларускую мову не вызначаны. Можна меркаваць, што яно актыўна функцыянуе каля ста пяцідзесяці гадоў, паколькі ў 1894 г. у Віцебску адбыліся першыя спаборніцтвы па веласіпедным спорце на Беларусі. *Слоўнік беларускай мовы* (1870) І. І. Насовіча, які змяшчае апісанне лексікі ўсходняй часткі Беларусі сярэдзіны XIX ст., слова яшчэ не фіксуе. Пісьмовае ўжыванне слова *веласіпед* упершыню засведчана на старонках газеты „Наша Ніва": *Каля мяне прагудзела на* ***веласіпедзе*** *паненка з двумя панічамі*[30] (1914, 24, с. 4). Слова *ровар*, у сваю чаргу, запазычана з англійскай мовы праз польскую (польск. rower ад англ. *rower* = валацуга, вандроўнік)[31]. П. У. Сцяцко, які даследаваў польскія намінацыі прадметаў матэрыяльнай культуры ў гаворках Зэльвеншчыны, устанавіў, што „ў народнай мове захаду Беларусі слова ровар актыўна функцыянуе ўжо каля ста гадоў"[32].

Цікавым з'яўляецца той факт, што ні слова *веласіпед*, ні слова *ровар* не зафіксаваны ў лексікаграфічных крыніцах 20-х гг. XX ст. Атрымоўваецца, што абодва варыянты маюць прыблізна аднолькавы час пранікнення ў беларускую мову і на пачатку свайго існавання ў ёй мелі толькі вусную сферу выкарыстання. Значыць, для спецыфікі рэгіянальнага і агульнамоўнага ўжывання вызначальным стаў фактар паходжання слоў. Паколькі з 30-х гг. XX ст. моўная палітыка была скіравана на збліжэнне моў народаў былога СССР з мовай рускага народа, то, пачынаючы з гэтага перыяду, лексікаграфічную фіксацыю атрымала слова *веласіпед*. Слова *ровар* не выйшла з ужытку, але было аднесена ў разрад дыялектнай лексікі, у той час як слова *веласіпед* атрымала статус нарматыўнага. Даволі працяглы час існавання слова *веласіпед* у якасці нарматыўнага вызначыў з'яўленне ў беларускай мове шэрагу новых слоў з часткай *вела*-: *веладром* (спецыяльна абсталяваная пляцоўка для веласіпедных гонак і трэніровак), *велабол* (спартыўная камандная гульня з мячом на веласіпедах), *велакамера* (камера для веласіпеда), *велакрос* (веласіпедныя гонкі па перасечанай мясцовасці), *веларыкша* (чалавек, які перавозіць пасажыраў на веласіпедзе), *велатрэк* (спецыяльная дарожка для гоначных спаборніцтваў на веласіпедзе), *веласіпедыст* (той, хто едзе на веласіпедзе, хто займаецца веласіпедным спортам), *велатур* (адзін круг ці этап веласіпедных гонак).

[29] A. M. Bułyka, *Słounik inszamounych słou*: u 2 t., t. 1: A–L, Minsk: Biełaruskaja encykłapiedyja, 1999, s. 280.

[30] *Słounik mowy „Naszaj Niwy" (1906–1915)* [ u 5 t.], t. 1: A–D, red. W. P. Lemciuhowa, Minsk: Technałohija, 2003, s. 285.

[31] A. M. Bułyka, *Słounik inszamounych słou* [u 2 t.], t. 2: M–Ja, Мінск: Biełaruskaja encykłapiedyja, 1999, s. 294.

[32] P. U. Sciacko, *Polskija naminacyi pradmietau materyjalnaj kultury u haworkach Zelwienszczyny*, [u:] *Mowaznauczy doswied (wybranyja twory)*: u 2 cz., cz. 1, *Dyjalektałohija*. *Suczasnaja mowa* i *mietodyka*. *Anamastyka*. *Mizmounyja stasunki*, Hrodna: Hrodzienski dziarżauny uniwiersitet, 2005, s. 283.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



Слова *ровар* не фіксавалася акадэмічнымі перакладнымі слоўнікамі, яго няма ў аднатомным *Тлумачальным слоўніку беларускай літаратурнай мовы*, пяцітомны *Тлумачальны слоўнік беларускай мовы* падае яго як дыялектнае. Шырокае адлюстраванне слова *ровар* у перыяд з 1930-х па 1990-я гг. атрымала толькі ў дыялектных слоўніках (у формах *ровар, ровал, ровор, ровэр, ровыр*): *Ён тады на **ровар** ускочыў і даў цугу, паспрабуй яго дажані*[33]*; **Ровал** купіў і раз'яжджае; Дзет цёгаў, цёгаў **ровара** і паламаў; Ехала **ровором***[34]*.* Словы *ровар* і *веласіпед* нават засведчаны ў складзе ўстойлівых выразаў: *вынайсці веласіпед* – 'гаварыць, аб'яўляць пра даўно ўсім вядомае'[35] і *ровар п'яных не любіць*[36]. *Значыць, на працягу 1930-х—1990-х гг. варыянты трывала ўвайшлі ў лексічны склад беларускай мовы, толькі слова веласіпед*, пад уплывам сацыяльна-культурных фактараў, на агульнамоўным узроўні (нарматыўны статус, словы з агульнай часткай *вела*-, фразеалагічнае ўжыванне), а слова *ровар* – на дыялектным (стылістычная памета абласное, абмежаванае тэрытарыяльнае ўжыванне, аднак разнастайнасць формаў і вытворнае слова *раварыст*).

Сітуацыя змянілася ў апошняе дзесяцігоддзе XX ст.: сучасны беларускамоўны друк часта карыстаецца (асабліва ў жанрах мастацкай літаратуры) словам *ровар*: *Я выходжу на вуліцу без паліто, сядаю на жоўта-зялёны **ровар**, якога па недарэчнай выпадковасці клічуць Кастанэдам*[37]*; Вуліца Школьная кароткая. Раней яна была брукаваная. Едзеш на **ровары**, зубы ляскаюць*[38]*; Нічога, што слова чужое, але як жа яно дарагое! Пясчаная разьежджаная дарога ў полі альбо лесе, зрэдзьчасу жвіроўка, у вёсках брукаванка – ня надта каб было дзе разагнацца **ровaрам** на Беласточчыне ў 60-я і 70-я гады. Дый цяпер асфальтовак пабольшала не нашмат. Але народ езьдзіў на **роварах** часта й густа. **Ровар** – аўтамашына дзятвы і бядоты*[39]. Акрамя таго, слова *ровар* зафіксавана таксама ў *Арфаграфічным слоўніку беларускай мовы* і ў *Беларуска-ўкраінскім слоўніку*.

У вусным маўленні і мастацкіх тэкстах лексемы *веласіпед* і *ровар* даволі шырока выкарыстоўваюцца побач у адным кантэксце: – *А ягонае захапленьне **ровaрамі**… **Вела**трэк, злажаны ў Лошыцы… Дзівосны сад…*[40]*; З Высокага (афіцыйна – Высока-Літоўск) прыехалі двое ўзброеных паліцыянтаў на „**ровэрах**" – так называлі **веласіпеды***[41]. Гэта сведчыць пра тое, што слоўнікавы склад літаратур-

[33] A. P. Cychun, *op. cit*., s. 122.
[34] *Słounik biełaruskich haworak paunoczna-zachodniaj Biełarusi i jaje pahraniczcza* [u 5 t.], t. 4, red. J. F. Mackiewicz, Мінск 1984, s. 298.
[35] I. J. Lepieszau, *Frazieałahiczny słounik biełaruskaj mowy,* u 2 t., t. 1: A–L, Minsk: Biełaruskaja encykłapiedyja,1993, s. 20.
[36] *Słounik biełaruskich haworak paunoczna-zachodniaj Biełarusi i jaje pahraniczcza*, *op. cit*., s. 29.
[37] A. Pakrouski, *Pryhody rowara pa mianuszcy Kastaneda*, „Dziejasłou" 2007, 3, s. 206.
[38] U. Sciapan, *Na wulicy Szkolnaj*, „Połymia" 2006, 2, s. 86.
[39] J. Maksimiuk, *Rowar*, „Arche" 2000, 7, s. 151.
[40] L. Rubleuskaja, *Noczy na Plabanskich młynach*, „Dziejasłou" 2007, 3, s. 46.
[41] U. Hniłamiodau, *Wiartannie (Siamiejnaja chronika u duchu baroka)*, „Połymia" 2006, 3, s. 38.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



най беларускай мовы мае дзве варыянтныя назвы для абазначэння „двух- або трохколай машыны для язды, што прыводзіцца ў рух націскнымі педалямі”.

Зыходзячы з прынцыпу эканоміі моўных сродкаў, на думку П. У. Сцяцко, з маўленчага боку перавагу мае новае слова – двухскладовае – параўнальна з традыцыйным чатырохскладовым[42]. Акрамя таго, слова *ровар* не мае выразных польскамоўных адзнак, а пра польскае паходжанне слова сведчыць гісторыя рэаліі, назвай якой яно выступае. Улічваючы тое, што абодва варыянты (*веласіпед* і *ровар*) з'яўляюцца запазычаннямі ў беларускай мове, прыблізна аднолькавымі па часе, слова *ровар* валодае патэнцыяльнай магчымасцю перамясціцца з перыферыі лексічнай сістэмы (дыялектнай лексікі) у сферу агульнамоўных лексічных сродкаў. Нават калі гэтага не адбудзецца, у адносінах да слова *ровар* патрабуе перагляду стылістычная памета абл., якая ўжо не актуальная.

У спецыяльных даведніках, працах і дапаможніках мясцовы моўны матэрыял адзначаецца як дыялектны. Але такое найменне ўсіх моўных з'яў, што маюць абмежаванае мясцовае пашырэнне ці прызначэнне, на думку А. А. Крывіцкага, не адпавядае ні іх сутнасці, ні агульнапрынятаму значэнню падобных слоў[43]. Даследчык сцвярджае, што правамерна тлумачыць словам дыялект такое слова ці выраз у літаратурнай мове, які мае адносіны да дыялекту або дыялектаў, г. зн. „з'яўляецца ўласнай асаблівасцю іх структуры, што ўтварае, характарызуе і адрознівае іх”[44]. Аднак нельга так называць усё тое, што мае абмежаванае функцыянальнае (у прыватнасці, вуснагутарковае) і прасторавае (тэрытарыяльнае) пашырэнне. У шырокім значэнні слова дыялектны раней ва ўсходнеславянскім моваўнаўстве найбольш ужывальным было слова *областной*, якое выкарыстоўвалася ў назвах слоўнікаў мясцовай лексікі і ў слоўніках літаратурнай мовы як памета мясцовых слоў, што не атрымалі шырокага выкарыстання ў сферы зносін (такую памету мае ў тлумачальным слоўніку і слова *ровар*).

Спецыфіка рэгіянальнага ўжывання слоў *веласіпед* і *ровар* адлюстравана ў 2-м выпуску *Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак*[45] (карта № 92). Арэал ужывання слова *ровар* распаўсюджваецца на тэрыторыю, якая галоўным чынам адносіцца да заходняй зоны лінгвістычнай групоўкі гаворак. Моўнае развіццё, найбольш на ўзроўні лексікі, на гэтай тэрыторыі мае дывергентны характар, абумоўлены уплывам і падтрымкай суседняй польскай мовы. Лексіка названага рэгіёну – гэта пераважна кангламерат розных моўных сістэм з рознымі колькаснымі функцыянальнымі суадносінамі паміж імі. У дадзеным выпадку трэба адрозніваць дыялектную мову і мясцовае маўленне, якое выступае не толькі рэалізацыяй таго ці іншага дыялекта, але з'яўляецца „разнастайным праяўлен-

[42] P. U. Sciacko, *Polskija*..., s. 283.
[43] A. A. Krywicki, *Rehianalnyja mounyja zjawy i ich linhwahieahraficznyja stratyfikacja*, „Biełaruskaja linhwistyka” 1996, wyp. 46, s. 3.
[44] *Ibid.*, s. 4.
[45] *Leksiczny atłas biełaruskich narodnych haworak u piaci tam*ach, t. 2. *Sielskaja haspadarka*, red. M. W. Biryła i J. F. Mackiewicz, Minsk 1994, karta 92.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



нем моўных ведаў мясцовага насельніцтва ў адпаведнасці з патрэбамі і традыцыямі мясцовых моўных зносін і іх моўным выхаваннем”[46]. У паслярэвалюцыйны час у беларускім мовазнаўстве ў якасці адпаведніка да слова *областной* было прапанавана слова *краёвы*. Аднак найбольш дакладным і зручным агульным азначэннем мясцовых моўных з’яў абмежаванага пашырэння (напрыклад, слова *ровар)* з’яўляецца слова *рэгіянальны*.

Змены і зрухі, што адбываюцца ў слоўнікавым складзе беларускай мовы, найбольш аператыўна і поўна знаходзяць адлюстраванне на старонках беларускамоўнага друку. Рэгулярнае выкарыстанне на старонках розных выданняў некаторых з паланізмаў дае досыць аб’ектыўную карціну ступені асваення і іх месца ў беларускім лексіконе. Напачатку яны выступалі адметнай рысай мовы недзяржаўных сродкаў масавай інфармацыі, але ужо ў пачатку XXI ст. пачалі без абмежавання ўжывацца ў публіцыстыцы, паэзіі і публічных выступленнях. Сучасны нацыянальны друк (асабліва ў жанрах мастацкай літаратуры) раўназначна карыстаецца словамі *трубка* і *слухаўка*, *карта* і *мапа*, *веласіпед* і *ровар*. Значыць, працэс неалагізацыі лексічнай сістэмы беларускай мовы, суадносіны паміж актыўным і пасіўным фондам лексікі, а таксама спецыфіка рэгіянальнага ўжывання некаторых слоў зведалі змяненні.

Прайшоўшы своеасаблівую апрабацыю ў СМІ, польскамоўныя варыянты пачалі ўжывацца досыць шырокім колам носьбітаў беларускай мовы. Таму і сучасны слоўнік павінен арыентавацца на як мага паўнейшае адлюстраванне жывога, актуальнага, рэальна існуючага лексічнага інвентару, у якім задзейнічаны ўвесь вопыт, рэсурсы і набыткі ў галіне мовы розных пакаленняў. Пры гэтым неабходна ўважліва ставіцца да выбару слова, усебакова разглядаючы мэтазгоднасць яго ўжывання замест ужо наяўнай у мове адзінкі і пазбягаючы празмернага захаплення навізной, якая можа прывесці да штучнасці і шаблоннасці.

## Бібліяграфія

**Bajkou Mikoła Niekraszewicz Ściapan**, *Biełaruska-rasiejski słounik*, Miensk 1926.

**Bialkiewicz Iwan Kandratawicz**, *Krajowy słounik uschodniaj Mahilouszczyny*, Minsk: Nawuka i technika, 1970.

***Biełaruskaja hramatyka*** [u 2 cz.], cz. 1: *Fanałohija. Arfaepija. Marfałohija. Słowautwarennie, Nacisk*, red. Mikałaj Wasilewicz Biryła, Pawieł Pauławicz Szuba, Minsk: Nawuka i technika, 1985.

**Bułyka Alaksandr Mikałajewicz**, *Słounik inszamounych słou*: [u 2 t.], t. 1: A–L, Minsk: Biełaruskaja encykłapiedyja, 1999.

**Bułyka Alaksandr Mikałajewicz**, *Słounik inszamounych słou* [u 2 t.], t. 2: M–Ja, Мінск: Biełaruskaja encykłapiedyja, 1999.

[46] A. A. Krywicki, *op. cit*., s. 4.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



**Cychun Apanas Piatrowicz**, *Skarby narodnaj mowy (z leksicznaj spadczyny nasielnikau Hrodzienskaha rajonu)*, Hrodna: Hrodzienski dziarżauny uniwiersitet im. Janki Kupały, 1993.

**Czyhryn Iwan Piatrowicz**, *Jaszcze adzin wyraj z naszych słou wioski Czamiary Słonimskaha rajona,* [u:] *Żywoje nasza słowa*. Dyjalektał. zb., NAN Biełarusi, Instytut mowaznaustwa im. Jakuba Kołasa, red. Lubou Piatrouna Kuncewicz, Iwan Jakaulewicz Jaszkin, Minsk 2001.

**Fiodorow Andriej Wieniediktowicz,** *Osnowy obszczej tieorii pieriewoda*, Moskwa: Izd-wo IJaz. RAN, 1996.

**Hniłamiodau Uładzimir**, *Wiartannie (Siamiejnaja chronika u duchu baroka)*, „Połymia" 2006, 3.

**Ipatawa Wolha**, *Alhierdawa dzida. Wiaszczun Hiedzimina*, Minsk 2002.

**Jawicz Jana**, *Adzinaja daczka*, „Litaratura i mastactwa" 2011, 4.

**Karatkiewicz Uładzimir**, *Kałasy pad siarpom twaim*: Raman, kn. pierszaja, druhaja. Dla siared. i st. szk. uzrostu, Junactwa, Minsk 1981.

**Krywicki Alaksandr Antonawicz**, *Rehianalnyja mounyja zjawy i ich linhwahieahraficznyja stratyfikacja*, „Biełaruskaja linhwistyka" 1996, wyp. 46.

**Lemciuhowa Walancina Piatrouna**, *Biełaruskaja akademicznaja leksikahrafija: stan, prablemy,* [u:] *Suczasnyja prablemy biełaruskaj leksikałohii i leksikahrafii*. Materyjały miżnarodnaj nawukowaj kanfierencyi, 19–20 listapada 2005 h., NAN Biełarusi, In-t mowaznaustwa imia Jakuba Kołasa, Minsk: Prawa i ekanomika, 2006.

**Lepieszau Iwan Jakaulewicz**, *Fraziealahiczny słounik biełaruskaj mowy* [u 2 t.], t. 1 A–L, Minsk: Biełaruskaja encykłapiedyja, 1993.

***Leksiczny atłas biełaruskich narodnych haworak u piaci tamach***, t. 2, *Sielskaja haspadarka*, red. Mikałaj Wasilewicz, Biryła i Józefa Fłaryjanauna Mackiewicz, Minsk 1994, karta 92.

**Łastouski Wacłau**, *Padruczny rasiejska-kryuski (biełaruski) słounik. Wydannie faksimilnaha typu*, Kouna 1924.

**Maksimiuk Janka**, *Rowar*, „Arche" 2000, 7.

**Pakrouski Andrej**, *Pryhody rowara pa mianuszcy Kastaneda*, „Dziejasłou" 2007, 3.

**Rubleuskaja Ludmiła**, *Noczy na Plabanskich młynach*, „Dziejasłou" 2007, 3.

**Pryhodzicz Mikałaj Ryhorawicz**, Ciwanowa Halina Kuźminiczna, *Starabiełaruski leksikon. Padruczny pierakładny слоўнік*, Minsk 1997.

**Sciacko Pawieł Uładzimirawicz**, *Polskija naminacyi pradmietau materyjalnaj kultury u haworkach Zelwienszczyny*, [u:] *Mowaznauczy doswied (wybranyja twory)*: u 2 cz., cz. 1, *Dyjalektałohija*. *Suczasnaja mowa* i *mietodyka*. *Anamastyka*. *Mizmounyja stasunki*, Hrodna: Hrodzienski dziarżauny uniwieritet, 2005.

**Sciacko Pawieł**, *Kultura mowy*, Minsk: Technałohija, 2002.

**Uładzimir Sciapan**, *Na wulicy Szkolnaj*, „Połymia" 2006, 2.

***Słounik biełaruskich haworak paunoczna-zachodniaj Biełarusi i jaje pahraniczcza***, [u 5 t.], t. 4, red. Józefa Fłaryjanauna Mackiewicz, Мінск: Nawuka i technika, 1984.

***Słounik biełaruskich haworak paunoczna-zachodniaj Biełarusi i jaje pahraniczcza***, [u 5 t.], t. 2, red. Józefa. Fłaryjanauna Mackiewicz, Minsk: Nawuka i Technika, 1980.

***Słounik haworak centralnych rajonau Biełarusi***, [u 2 t.], t. 1, red. Jeudakija Sciapanauna. Miacielskaja, Minsk: Uniwiersiteckaje, 1990.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



**Słounik mowy „Naszaj Niwy" (1906–1915**) [ u 5 t.], t. 1: A–D, red. Walancina Piatrouna Lemciuhowa, Minsk: Technałohija, 2003.

**Strukawa Swiatłana Michajłauna,** *Słounik archaizmau i histaryzmau (pa tworach biełaruskaj mastackaj litaratury i publicystycy)*, Minsk 2007.

**Szakun Lew Michajławicz**, *„Усходнія" i „zachodnija" krynicy papauniennia leksicznych srodkau biełaruskaj mowy*, „Wiesn. Bieł. dziarż. un-ta". Sier. 4. Fiłałohija. Żurnalistyka. Piedagogika. Psichałohija, Minsk 1995.

**Tarasau Kastuś**, *Try życci kniahini Rahniedy,* Minsk 1997.

***Tłumaczalny słounik biełaruskaj mowy*** [u 5 t.], t. 2, red. Kandrat Kandratawicz Atrachowicz (Kandrat Krapiwa), Minsk 1978.

***Turauski słounik***, u 5 t., t. 3. [Skład. Alaksandr Antonawicz Krywicki, Henadź Apanasawicz. Cychun, Iwan Jakaulewicz Jaszkin], Minsk: Nawuka i technika, 1984.

**Ułasiewicz Wiktoryja Iwanauna**, *Słounik nowych słou biełaruskaj mowy*, Minsk: TetraSistems, 2009.

**Ułasiewicz Wiktoryja Iwanauna**, Dauhulewicz Natalla Mikałajeuna, *Leksicznyja pracesy u biełaruskaj mowie kanca XX – paczatku XXI stst.*, [w:] *Nacionalni mowy i kultury w jich specyfici ta wzajemodiji*, „Mowa i kultura" (Naukowyj żurnał), Kyjiw 2007, wyp. 9, t. 6 (94).

**Żdan Aleh**, *Czas idzie*, „Połymia" 1998, 7.

## Streszczenie

Od lat 80. XX wieku w publicystyce białoruskiej coraz częściej jest wykorzystywane, zwłaszcza w periodykach, słownictwo zapożyczone z języka polskiego. Początkowo używano polonizmów z przyczyn stylistycznych (nadawały tekstom ekspresji, stwarzały wrażenie nowości). Późniejsze badania wykazały, że owa nowość wielu tego rodzaju leksemów była względna. Tą cechą odznaczały się wyrazy, które już wcześniej występowały w języku białoruskim, wyszły jednak z aktywnego użycia, a obecnie powtórnie się uaktywniły. Osobliwością takich zapożyczeń jest to, że nie służą oznaczaniu nowych realiów i pojęć, ale są leksykalnymi wariantami jednostek, które już funkcjonują w języku w tym samym znaczeniu.

**Słowa kluczowe**: zapożyczenie, wariant leksykalny, komponent, para wariantów

## Рэзюме

З канца 80-х гг. XX ст. у беларускамоўнай публіцыстыцы павялічылася колькасць польскамоўных лексічных сродкаў, якія выкарыстоўваліся ў першую чаргу на старонках перыядычнага друку. На пачатковым этапе ужыванне паланізмаў надавала тэкстам экспрэсію і стварала ўражанне навізны. Пазней даследаванні паказалі, што навізна некаторых з лексем – толькі адносная. Адносны характар навізны мелі тыя са слоў, што ўжо былі вядомыя беларускай мове, аднак выйшлі з актыўнага ужытку і цяпер уяўляюць сабою адраджэнне ранейшых моўных здабыткаў. Асаблівасць такіх запазычанняў у тым, што

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 05/12/2025 00:16:28



яны не служаць для абазначэння новых рэалій і паняццяў, а з'яўляюцца лексічнымі варыянтамі адзінкак, што ўжо функцыянуюць у мове з тоеснымі значэннямі.

**Ключавыя словы:** запазычанне, лексічны варыянт, кампанент, варыянтная пара, кадыфікаваная адзінка

## Summary

Since the late 80s. XX century we observe the process of increase of Polish lexical resources in the Belarusian press. Initially, the words borrowed from the Polish language gave texts an expression and seemed to be new. Later, studies have shown that the novelty of certain words is only apparent. The relative nature of the news were those words which were already known in the Belarusian language but came out of active use and today they are nothing else but an evidence of the revival of the old linguistic heritage. The peculiarity of these loans is that they do not serve to identify new realities and concepts, and represent variants of lexical units that already exist in the same familiar meanings.

**Key words:** loan-word, lexical variant, component, variant pair, codification of unit